Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 280 (349) ЧАЦВЕР 5 СНЕЖНЯ 1940 г.

Цана 10 капеек.

Сёння народы Совецкага Саюза радасна святкуюць 4-ю гадавіну з дня прыняцця Сталінскай Канстытуцыі

Канстытуцыя краіны соцыялізма

З найвялікшай радасцю святкуе сёння совецкі народ дзень Сталінскай Канстытуцыі. Новая Канстытуцыя СССР прынята Надзвычайным VIII з'ездам Советаў 5 снежня 1936 года. Народ назваў новую Канстытуцыю Сталінскай—па імені яе вялікага творца таварыша Сталіна.

Гісторыя чалавецтва не ведала канстытуцыі, падобнай Сталінскай. Канстытуцыі буржуазных краін узаконьваюць дыктатуру буржуазіі, эксплаатацыю чалавека чалавекам, прыгнечанне адной нацыі другой. Сталінская Канстытуцыя зыходзіць з факта ліквідацыі капіталістычнага ладу ў СССР і перамогі соцыялізма, ёй чужда нацыянальная рознь людзей.

Аснову Канстытуцыі СССР складаюць прынцыпы соцыялізма: соцыялістычная ўласнасць на зямлю, лясы, фабрыкі, заводы, прылады і сродкі вытворчасці, ліквідацыя эксплаатацыі і эксплаатататарскіх класаў, ліквідацыя галечы большасці і раскошы меншасці, ліквідацыя беспрацоўя. Сталінская Канстытуцыя гарантыруе кожнаму грамадзяніну СССР права на працу.

Буржуазныя канстытуцыі таксама фіксіруюць правы грамадзян на працу. Аднак яны гэта нічым не гарантыруюць, і словы застаюцца словамі. Канстытуцыя СССР гарантыруе грамадзянам ажыццяўленне ўсіх правоў: права на працу, права на адпачынак, права на асвету, права на забяспечаную старасць.

Канстытуцыя перамогшай краіны соцыялізма ўскладае на грамадзян СССР і вялікія абавязкі. У артыкуле 12 Канстытуцыі запісана: «Праца ў СССР з'яўляецца абавязкам і справай чэсці кожнага здольнага да працы грамадзяніна па прынцыпу: «хто не працуе, той не есць». Грамадзянін соцыялістычнай дзяржавы абавязан выконваць законы, абараняць соцыялістычную ўласнасць, як свяшчэнную і недатыкальную аснову соцыялістычнага ладу, захоўваць дысцыпліну працы, абараняць соцыялістычную бацькаўшчыну ад ворагаў.

«Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна СССР», — гаворыцца ў 133 артыкуле Канстытуцыі. Воінская служба ў радах нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі прадстаўляе пачотны абавязак грамадзян СССР.

Прыняцце Сталінскай Канстытуцыі стала магчыма не адразу пасля пролетарскай рэволюцыі. Рабочыя і сяляне СССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі амаль 20 год самаафярна змагаліся з усялякага роду ворагамі і пабудавалі соцыялістычнае грамадства. Таварыш Сталін па VIII Надзвычайным З'ездзе Советаў аб праекце Канстытуцыі гаварыў: «У рэзультаце пройдзенага шляху барацьбы і лішэнняў прыемна і радасна мець сваю Канстытуцыю, якая трактуе аб пладах нашых перамог. Прыемна і радасна ведаць, за што біліся нашы людзі і як яны дабіліся сусветна-гістарычнай перамогі. Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарам, што яна дала свае рэзультаты».

Пасля прыняцця Сталінскай Канстытуцыі совецкі народ дабіўся новых сусветна-гістарычных поспехаў. Да многамільённай сям'і совецкага народа далучыліся працоўныя заходніх абласцей Украіны і Беларусі, працоўныя Бесарабіі, Паўночнай Букавіны, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Вялікі Совецкі Саюз яшчэ больш узмацнеў і павялічыўся, а капіталістычны свет пацясніўся.

Працоўныя заходніх абласцей Беларусі пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі жывуць усяго толькі 14 месяцаў. Але і за гэты кароткі тэрмін яны дабіліся выключна вялікіх поспехаў. Да непазнавальнасці мяняецца вобраз гарадоў, мястэчак і вёсак. Цэнтр нашай вобласці Беласток становіцца другім тэкстыльным цэнтрам Саюза. Пераабсталяваныя, рэканструіраваныя тэкстыльныя камбінаты і фабрыкі даюць у гэтым годзе больш 10 мільёнаў метраў высокаякасных тканін. Усе другія галіны прамысловасці таксама паспяхова выконваюць планы.

У вобласці арганізавана 165 калгасаў. Яны аб'ядналі звыш 7 тысяч гаспадарак. Ураджай на калгасных палях быў значна вышэйшы, чым у аднаасобных гаспадарках. Калгаснікі калгаса «Большэвік», Валкавыскага раёна, на кожны працадзень атрымліваюць па 7 кілаграмаў зернавых, 15 кілаграмаў бульбы і інш. Сям'я Сямёна Зыбко толькі авансам за 7 месяцаў атрымала 3 тоны зернавых, 6 тон бульбы, многа грошай. Такіх-жа вынікаў дабіліся многія калгасы.

У вобласці працуе 1.450 пачатковых і сярэдніх школ, з іх 235 адкрыты ў гэтым годзе. У школах навучаецца 207.334 вучні — на 30 тысяч больш, чым у 1939 годзе.

Арганізаван педагагічны інстытут і педвучылішчы, тэкстыльны тэхнікум і іншыя сярэднія навучальныя ўстановы.

Працоўныя нашай вобласці ўпершыню ў сваім жыцці пабывалі ў дамах адпачынку, у санаторыях і на курортах. 860 тэкстыльшчыкаў правадзілі свае водпускі ў дамах адпачынку. Профсаюз тэкстыльшчыкаў выдаткаваў 130 тысяч рублёў на санаторнае лячэнне рабочых. Вялікія грашовыя сродкі выдаткаваны і іншымі профсаюзамі на адпачынак і лячэнне рабочых.


Працоўныя нашай вобласці шчыра дзякуюць партыі і ўраду за бацькоўскія клопаты. Яны кожны дзень павышаюць усё больш і больш прадукцыйнасць працы. Палітычная актыўнасць рабочых, сялян і інтэлігенцыі расце з кожным днём. Выбарчая кампанія ўскалыхнула дзесяткі тысяч людзей, якія актыўна працуюць членамі ўчастковых і акруговых выбарчых камісій, агітатарамі, даверанымі.

Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Советаў вылучаны самыя лепшыя з лепшых: рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя — стаханавец Курыльскі, артыст Вашчэровіч, селянін Ічкоўскі. Сярод кандыдатаў вялікая колькасць жанчын. Вылучана калгасніца Хелена Літман, стаханаўка-тэкстыльшчыца Сцепаніда Жылюк, мастак Натальля Ландау і іншыя. Тое, аб чым доўгія годы марылі народы заходніх абласцей, знаходзячыся пад прыгнётам памешчыкаў і капіталістаў, ажыццявілася. Народ стаў гаспадаром, куе сам сябе новае радаснае жыццё пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі

У беластоцкім Доме партыйнай асветы адкрылася выстаўка літаратуры, прысвечаная дню Сталінскай Канстытуцыі. Сярод выстаўленых кніг і брашур — Канстытуцыя краіны соцыялізма на розных мовах народаў СССР, Канстытуцыі саюзных рэспублік, альбом, які адлюстроўвае дасягненні нашай радзімы за годы дзеяння сталінскага закона, кніга Н. К. Крупскай «Жанчына краіны Советаў — роўнаправны грамадзянін», зборнік артыкулаў і заметак пад назвай «Народы СССР аб Сталінскай Канстытуцыі» і рад іншых.

Да дня Канстытуцыі Дом партыйнай асветы арганізаваў цікавую фотавыстаўку, якая расказвае пра новае, шчаслівае жыццё народаў заходніх абласцей Украіны і Беларусі. Здымкі сялянскіх дзяўчат-чыгуначніц, шчаслівых дзяцей у новых яслях і дзіцячых дамах, рад здымкаў пра сялян вызваленых абласцей Украіны і Беларусі, якія авалодваюць складанай совецкай сельскагаспадарчай тэхнікай, наглядна паказваюць новае цудоўнае жыццё працоўных над праменнямі вялікага закона — Сталінскай Канстытуцыі.



Учора ў Беластоку адбыўся 50-тысячны мітынг, прысвечаны дню Сталінскай Канстытуцыі. На здымку: Калона 1-га тэкстыльнага камбіната накіроўваецца на мітынг.

Фота А. Сапіра.

Масква, Крэмль.

Таварышу Сталіну

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Агульнагарадскі мітынг працоўных горада Беластока, прысвечаны Дню Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у мясцовыя Советы, шле Вам палкае, сардэчнае прывітанне!

Доўгія годы рабочыя, сяляне, працоўная інтэлігенцыя панскай Польшчы таміліся пад ігам капіталістаў і памешчыкаў.

Галеча і голад, знявагі і здзекі былі лёсам працоўных—беларусаў і палякаў, украінцаў і яўрэяў. Лепшыя сыны народа мучыліся ў турмах.

У верасні мінулага года настаў светлы час вызвалення. Вялікі Совецкі Саюз працягнуў нам брацкую руку дапамогі. З Вашым імем на вуснах воіны Чырвонай Арміі перайшлі граніцу. З Вашым імем на вуснах сустрэлі мы сваіх братоў.

Мы шчаслівы, любімы наш правадыр і бацька! Над намі ззяе сонца Сталінскай Канстытуцыі. У адзінай сям'і народаў Совецкага Саюза знайшлі мы сваё шчасце.

Нам дадзена права на працу. 20 тысяч беспрацоўных, якія налічваліся па гораду да моманту вызвалення Заходняй Беларусі, атрымалі работу. Памнажаецца лік стаханаўцаў, ударнікаў, многастаночнікаў, на прадпрыемствах шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Праца стала справай чэсці, справай славы, справай доблесці і геройства.

Нам дадзена права на адпачынак, які забяспечваецца ўстанаўленнем штогодніх водпускаў рабочым і служачым з захаваннем заработнай платы, прадастаўленнем для абслугоўвання працоўных шырокай сеткі санаторыяў, дамоў адпачынку, клубаў. У гэтым годзе ў дамах адпачынку і санаторыях правялі ўжо свой водпуск 4.781 чалавек.

Нам дадзена права на асвету. Совецкі ўрад у 1940 годзе асігнаваў на гэтую справу 9,5 мільёнаў рублёў па гораду Беластоку. Адкрыта 34 школы, 1 педагагічны інстытут, 1 педагагічнае вучылішча, 1 рабфак. Ва ўсіх школах горада абучаецца 13.530 вучняў.

Нам дадзена права па матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы і страты працаздольнасці.

Роўнаправе грамадзян усіх нацыянальнасцей, роўнаправе жанчын, свабода слова, друку, сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый — усё гэта дадзена нам Сталінскай Канстытуцыяй.

Новае, заможнае, культурнае жыццё расцвіло на вызваленай зямлі. З велізарным уздымам рыхтуюцца працоўныя нашага горада да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Разгарнулася шырокая работа на выбарчых участках, агітацыя за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Мы абавязуемся яшчэ шырэй разгарнуць агітацыйна-масавую работу, выбраць у дэпутаты мясцовых Советаў лепшых людзей, бязмежна адданых радзіме, справе партыі Леніна—Сталіна.

Мы абавязуемся сустрэць дзень выбараў новымі поспехамі на працоўным фронце, выпускам высокаякаснай прадукцыі, датэрміновым выкананнем вытворчых планаў. Прыкладзем усе сілы да выканання пастаўленай перад намі задачы: «зрабіць Беласток другім Іванавам!»

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! У знамянальны дзень Сталінскай Канстытуцыі ўсе нашы думкі накіраваны да Вас — нашага правадыра, друга і настаўніка. Займаючыся творчай плённай працай, мы нязменна памятаем ваша ўказанне: «Трымаць увесь народ у стане мабілізацыйнай гатоўнасці». Міжнародная абстаноўка напружана да крайнасці, за рубяжамі нашай радзімы палае полымя другой імперыялістычнай вайны.

Вялікі совецкі народ, дзякуючы мудрай сталінскай знешняй палітыцы, жыве і працуе ў мірнай абстаноўцы.

Мы не забываем аб капіталістычным акружэнні і гатовы ў любую мінуту стаць на абарону сваёй соцыялістычнай радзімы.

Няхай жыве наша цудоўная Радзіма — вялікі Совецкі Саюз!

Няхай жыве сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве творэц самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі, наша сонца, наша радасць, наш правадыр і настаўнік Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Прынята на агульнагарадскім мітынгу працоўных Беластока 4 снежня 1940 г.

50-тысячны мітынг працоўных Беластока, прысвечаны дню Сталінскай Канстытуцыі

Як толькі над горадам пачалі згушчацца вячэрнія змрокі, на плошчу Советаў рушылі калоны працоўных. Яны ішлі з фабрык і заводаў, устаноў і прадпрыемстваў, высока ўзнімаючы над галовамі чырвоныя сцягі і партрэты таго, хто стварыў самую дэмакратычную ў свеце Канстытуцыю, — вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. Маляўнічыя плакаты ілюстрыруюць артыкулы Сталінскай Канстытуцыі, шматлікія лозунгі заклікаюць выбаршчыкаў 15 снежня аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. З усіх канцоў горада на плошчу далятаюць песні лікуючага народа.

Плошча запаўняецца рабочымі, інтэлігенцыяй, чырвонаармейцамі. На трыбуне — кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый, прадстаўнікі гарнізона, фабрык і інтэлігенцыі, дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

6 гадзін 30 мінут. Уступнай прамовай сакратар гарадскога камітэта партыі тав. Раманаў адкрывае мітынг, прысвечаны дню Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, лабарантцы 3-га тэкстыльнага камбіната Гонараце Петрак. Сваю прамову яна гаворыць на польскай мове:

— VIII Надзвычайны Ўсесаюзны З'езд Советаў аб'явіў дзень прыняцця Сталінскай Канстытуцыі ўсенародным святам. У гэты дзень мы, вызваленыя працоўныя заходніх абласцей Беларусі, аглядаем нашы дасягненні, дэманстрыруем сваю любоў і адданасць комуністычнай партыі і творцу Канстытуцыі вялікаму Сталіну.

Тав. Петрак гаворыць аб вялікіх правах працоўных, забяспечаных Сталінскай Канстытуцыяй.

На яўрэйскай мове гаворыць прамову кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета ад маслабойнага завода тав. М. Шварц.

Беларускі паэт, кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета Максім Танк у сваёй прамове гаворыць аб тым, як праменні Сталінскай Канстытуцыі пранікалі праз калючыя драты граніцы ў Заходнюю Беларусь, будзілі і паднімалі на барацьбу супроць подлых акупантаў. І вось зараз сонца Сталінскай Канстытуцыі поўнасцю асвятліла і абагрэла абяздолены ў мінулым заходнебеларускі край.

На мітынгу выступіў таксама рабочы 1-га тэкстыльнага камбіната, кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета тав. Канопка.

Прадстаўнік Беластоцкага гарнізона тав. Ухараў у сваім выступленні запэўніў, што заваёвы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, надзейна ахоўваюцца нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй, якая гатова па першаму закліку партыі і ўрада ўшчэнт разграміць любога ворага, што пасмее парушыць наша мірнае і шчаслівае жыццё.

Выступаўшыя на мітынгу прамоўцы гаварылі таксама аб абавязках грамадзян Совецкага Саюза, запісаных у Канстытуцыі. Яны абяцалі яшчэ вышэй узняць прадукцыйнасць працы і гэтым яшчэ больш умацаваць гаспадарчую і абаронную магутнасць краіны соцыялізма.

Пад бурныя апладысменты і магутныя крыкі «ура!» 50-тысячны мітынг працоўных Беластока паслаў прывітальнае пісьмо творцу Канстытуцыі, правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

141. Па акрузе **№ 104** зарэгістрыраван Франц Сямёнавіч **Рудзінскі,** 1900 года нараджэння, беспартыйны, майстар рамонтнага цэха плюшавай фабрыкі, вылучаны калектывам рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў плюшавай фабрыкі.

142. Па акрузе **№ 106** зарэгістрыраван Павел Якаўлевіч **Сенькевіч,** 1905 года нараджэння, член ВКП(б), намеснік старшыні Беластоцкага горвыканкома, вылучаны калектывам паравознага дэпо станцыі Беласток.

143. Па акрузе **№ 108** зарэгістрыраван Якаў Абрамавіч **Кіркаешта,** 1908 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык аддзелам агітацыі і прапаганды Беластоцкага гаркома партыі, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых электрастанцыі горада Беластока.

144. Па акрузе **№ 109** зарэгістрыраван Якуб Гіршавіч **Бонк,** 1908 года нараджэння, беспартыйны, апаратыўны ўпаўнаважаны Упраўлення міліцыі Беластоцкай вобласці, вылучаны калектывам супрацоўнікаў абласнога Упраўлення рабоча-сялянскай міліцыі.

145. Па акрузе **№ 110** зарэгістрыравана Валенціна Мітрафанаўна **Кавалеўская,** 1912 года нараджэння, член ВЛКСМ, галоўны інжынер 6-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам рабочых і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната.

146. Па акрузе **№ 112** зарэгістрыравана Вера Іванаўна **Рашко,** 1916 года нараджэння, беспартыйная, работніца 6-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам гэтага-ж камбіната.

147. Па акрузе **№ 115** зарэгістрыраван Аляксандр Нікалаевіч **Прэдко,** 1915 года нараджэння, беспартыйны, рабочы хромавага цэха арцелі «Аб'яднанне», вылучаны калектывам членаў гэтай-жа арцелі.

148. Па акрузе **№116** зарэгістрыравана Хана Лейбаўна **Айзіна,** 1915 года нараджэння, беспартыйная, партніха цэха масавага пашыву арцелі «Чырвоны швейнік», вылучаная калектывам арцелі «Чырвоны швейнік».

149. Па акрузе **№ 117** зарэгістрыравана Аляксандра Карлаўна **Кулікоўская,** 1912 года нараджэння, беспартыйная, работніца арцелі «Чырвоная звязда», вылучаная калектывам арцелі «Чырвоная звязда».

150. Па акрузе **№ 118** зарэгістрыраван Абрам Калманавіч **Буковіч,** 1901 года нараджэння, беспартыйны, старшыня промстрахкасы, вылучаны калектывам членаў арцелі «17 верасня».

151. Па акрузе **№ 120** зарэгістрыраван Іван Сяргеевіч **Краўчанка,** 1902 года нараджэння, член ВКП(б), дырэктар педінстытута, вылучаны калектывам прафесарска-выкладчыцкага састава, студэнтаў, служачых і тэхнічных работнікаў педінстытута.

152. Па акрузе **№ 123** зарэгістрыраван Сяргей Барысавіч **Гудзееў,** 1905 года нараджэння, член ВКП(б), загадчык ваенным аддзелам Беластоцкага гаркома КП(б)Б, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых тэкстыльнай фабрыкі № 11.

153. Па акрузе **№ 124** зарэгістрыраван Дзмітрый Паўлавіч **Баркун,** 1913 года нараджэння, член ВЛКСМ з 1931 г., кандыдат ВКП(б) з 1939 г., сакратар гаркома комсамола, вылучаны калектывам Беластоцкага педагагічнага вучылішча і рабфака.

154. Па акрузе **№ 125** зарэгістрыравана Дора Грыгор'еўна **Медведзкая,** 1904 года нараджэння, член ВКП(б), нарсуддзя 1-га ўчастка горада Беластока, вылучаная калектывам работнікаў суда і абл'юста.

155. Па акрузе **№ 126** зарэгістрыравана Ядвіга Антонаўна **Тамашэвіч,** 1906 года нараджэння, беспартыйная, урач-тэрапеўт 5-й гарадской паліклінікі, вылучаная калектывам работнікаў 1-й, 4-й, 5-й паліклінік.

156. Па акрузе **№ 127** зарэгістрыравана Шэйндля Майсееўна **Левіна,** 1911 года нараджэння, беспартыйная, работніца абутковай фабрыкі № 2, вылучаная калектывам рабочых і служачых гэтай-жа фабрыкі.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Суражскай выбарчай акругі № 67, Лапскага раёна! 15 снежня ўсе якадзін аддавайце свае галасы за Марцэля Матвеевіча НАВОТКА!

★ ★ ★

Марцэль Матвеевіч Навотка

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*).

Станцыі і поўстанкі былі забіты адступаўшымі белагвардзейскімі войскамі Пілсудскага. На станцыі Лапы ў тэрміновым парадку пагружаліся афіцэры, памешчыкі і іх сем'і.

Да кіраўніка мясцовай рабочай кааперацыі Марцэля Навотка з'явілася дэлегацыя ўцякаўшых і бесцэрамонна патрабавала выдачы прадуктаў, пры чым бясплатна.

— Я гэтага не магу зрабіць, — рашуча заявіў Марцэль Навотка.

— Гэты кааператыў не з'яўляецца маім. Яго стварылі рабочыя за свае грошы.

Паследавала ярасная лаянка афіцэра і пагроза па адрасу кіраўніка рабочага кааператыва. Затым падаспеўшая ўзброеная шайка афіцэраў пачала разбіваць і грабіць магазін.

Назаўтра перадавыя часці Чырвонай Арміі з боем фарсіравалі раку Нарэў і ўступілі ў горад. Чырвоных байцоў радасна сустрэлі рабочыя і працоўнае насельніцтва. У Лапах быў створан рэўком, у састаў якога ўвайшоў сакратаром Марцэль Навотка.

Як рэвалюцыйны апаратус кіруючы орган совецкай улады, рэўком з дня на дзень умацоўваўся. Яго напружаная гарачая работа хутка дала свае рэзультаты. Аднавілася работа паравоза-вагонарамонтнага завода, была арганізавана чыгуначная міліцыя, наладжана забеспячэнне горада ўсім неабходным.

Праз некалькі дзён Марцэль Навотка накіраваўся ў Беласток для наладжвання сувязі з Цэнтральным рэвалюцыйным камітэтам Польшчы, а таксама за атрыманнем неабходнай літаратуры. У Беластоку яму сказалі:

— З вамі жадае пагаварыць Дзержынскі.

Марцэль Навотка захваляваўся. Прадстаяла гутарка з чалавекам, які з'яўляўся бліжэйшым саратнікам геніяльных правадыроў пролетарскай рэвалюцыі Леніна і Сталіна.

Марцэль пастукаў у дзверы кабінета Дзержынскага.

— Увайдзіце, калі ласка!

Сярод пакоя, каля пісьмовага стала, стаяў высокі чалавек у ваенным мундзіры.

— Навотка Марцэль—сакратар Лапскага рэўкома,—адрэкамендаваўся тав. Навотка і прад'явіў свае дакументы.

Фелікс Эдмундавіч прывітаўся і запрасіў яго прысесці.

— Раскажыце, што ў вас чуваць і што вы робіце?—запытаў Дзержынскі.

Сакратар рэўкома расказаў аб пуску завода, аб мерапрыемствах рэўкома па ахове чыгункі і станцыі, па забеспячэнню прадуктамі і палівам горада.

— Вельмі добра,—сказаў Дзержынскі,—і тут-жа дадаў: беражыце завод, як зрэнку вока, больш рашуча вядзіце барацьбу з сабатажам і контррэвалюцыяй. У вас яшчэ не ўсё добра.

Марцэль Матвеевіч уважліва слухаў. Пасля невялікай паузы Дзержынскі сказаў:

— Я маю да вас, тав. Навотка, яшчэ адну просьбу, уласна—гэта даручэнне партыі.

Фелікс Эдмундавіч падняўся з-за стала і, задумаўшыся, прайшоўся па пакою.

— Не так даўно, як вам напэўна вядома,—пачаў ён,— тут былі зверска забіты члены совецкай мі-



сіі Чырвонага Крыжа з Весялоўскім на чале. Яны накіроўваліся назад, у Маскву. Гэта здарылася недзе ў ваколіцах Мазавецкага павета. Дзе знаходзіцца іх магіла — невядома да гэтага часу. Трэба знайсці іх гроб, пахаваць з ушанаваннем, паставіць помнік, склікаць над магілай мітынг працоўных.

— Я гэта пастараюся зрабіць,— усхвалявана адказаў Марцэль Матвеевіч.

Атрымаўшы яшчэ некаторыя практычныя ўказанні і парады ад Дзержынскага, Марцэль Матвеевіч вярнуўся ў горад Лапы.

* * *

Мінула 20 год. І вось Марцэль Матвеевіч Навотка зноў у г. Лапы.

На агульных сходах калгаснікаў і сялян Пасвянткоўскага сельсовета, Лапскага раёна, Марцэль Навотка вылучан кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета і зарэгістрыраван для балатыроўкі па Суражскай выбарчай акрузе № 67. Агульным сходам служачых г. Лапы яго кандыдатура вылучана і зарэгістрыравана па выбарах у Лапскі раённы Совет дэпутатаў працоўных і гарадскі Совет.

Сустракаючыся на сходах з сваімі выбаршчыкамі, Марцэль расказвае сваю біяграфію скромна і коратка.

Нарадзіўся Марцэль Матвеевіч Навотка ў 1893 годзе, у сям'і батрака, у маёнтку графа Красіцкага, Ціханоўскага павета, Плоцкай губерні. З 12 год ён пачаў працаваць у маёнтку. У 1911 годзе граф звольніў бацьку. Навошта яму непрацаздольны стары? Графа мала цікавіць, што батрак Навотка згубіў сваё здароўе на рабоце ў яго маёнтку. Батракоў многа.

Сям'я пераехала ў г. Цэханаў. Тут Марцэль паступіў на цукровы завод. Работа на прадпрыемстве зблізіла яго з рэвалюцыйна настроенымі рабочымі. Ён бачыў, што рабочыя таксама церпяць гнёт і несправядлівасць, як і батракі ў графскім маёнтку.

У 1916 годзе Марцэль Матвеевіч уступіў у соцыял-дэмакратычную партыю Польшчы і Літвы. З 1918 года тав. Навотка—у КПРП (Комуністычная партыя рабочых Польшчы), а з 1924 года—у КПП (Комуністычная партыя Польшчы).

У канцы 1918 і пачатку 1919 года Марцэль працаваў сакратаром профсаюза батракоў у Цэханаве. У верасні 1919 года паследаваў першы арышт. Але праз месяц ён быў вызвален з-за адсутнасці доказаў.

Вайна з совецкай Расіяй у 1920 годзе выклікала хвалю рэпрэсій да комуністаў і ўсіх тых, хто быў супроць гэтай вайны. Зноў арышты... З прыходам Чырвонай Арміі (канец ліпеня 1920 года) Марцэль Матвеевіч—сакратар Лапскага рэўкома.

Пасля адходу чырвоных войск з-пад Варшавы тав. Навотка быў накіраван партыяй у Дамброўскі вугальны басейн. З сакавіка 1921 года тав. Навотка кіраваў рабочай кааперацыяй у г. Страхавіцы. Потым Познань. Працуючы сакратаром Пазнаньскага акруговага саюза батракоў, ён кіраваў успыхнуўшай забастоўкай гэтых батракоў, якая закончылася перамогай. За гэта Марцэль Матвеевіч прасядзеў год у Гнезненскай турме (пад Пазнанню).

Але рэпрэсіі і праследванні толькі загартоўвалі волю да барацьбы. Выйшаўшы з турмы, Марцэль Навотка працаваў у кіруючых партыйных органах Лодзі, Дамброва і інш. У 1929 годзе яго арыштавалі за прыналежнасць да КПП. 4 гады турмы—і зноў работа. Марцэль — партыйны інструктар сельскіх акруг. У 1934 годзе быў арыштаван на 6 тыдняў, а ў 1935 годзе яго арыштавалі ў апошні раз...

Дэфензіве, пракурору, суду было вядома амаль усё аб рабоце Марцэля Матвеевіча Навотка. Пракурор рабіў упор на яго сувязі з Чырвонай Арміяй, на работу ў рэўкоме і патрабаваў самай суровай кары. Навотка асудзілі на 12 год турмы.

У пачатку верасня 1939 года, калі пачалася вайна з Германіяй і войскі разам з жандармерыяй пакінулі Равіч, частка зняволеных, вырваўшыся з камер, атабрала ключы ў астаўшыхся турэмшчыкаў і вызваліла ўсіх астатніх. Палітзняволеных у двары турмы Марцэль Матвеевіч пастроіў, і калона ў некалькі сот чалавек рушыла на Ўсход...

Паліцэйскія ўлады іх не смелі арыштаваць, бо насельніцтва сустракала змагароў за справу працоўных з захапленнем. Раздаваліся воклічы з натоўпу, сустракаўшага калону палітзняволеных: «Не вам, а нашым гора-правіцелям трэба было сядзець у турме!».

Калона ішла на Ўсход. Ішла насустрач Чырвонай Арміі, Совецкаму Саюзу, новаму жыццю...

Зараз Марцэль Навотка працуе старшынёй Лапскага райвыканкома.

Вылучаны кандыдатам у дэпутаты абласнога, Лапскага раённага і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных, верны сын свайго народа— Марцэль Матвеевіч Навотка апраўдае давер'е выбаршчыкаў з чэсцю.

Н. Ражкоў.

ЯК БЫЛА ПРЫНЯТА СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ

Шостага лютага 1935 года VII Усесаюзны З'езд Советаў пастанавіў унесці змяненні ў Канстытуцыю СССР, прынятую ў 1924 годзе.

Была створана Канстытуцыйная Камісія пад старшынствам таварыша Сталіна. Камісія выпрацавала праект новай Канстытуцыі СССР, які быў 12 чэрвеня 1936 года апублікаван для ўсенароднага абмеркавання.

УСЕНАРОДНАЕ АБМЕРКАВАННЕ

Праект Асноўнага Закона совецкай дзяржавы, прасякнуты глыбокім дэмакратызмам, ускалыхнуў самыя шырокія слаі насельніцтва краіны. Чытаючы гэты праект, унікаючы ў яго словы, абмяркоўваючы яго, людзі па-новаму ўбачылі самых сябе.

У Маскве і на берагах Ціхага акіяна, у Архангельску і ў Крыму, ля адгор'яў Паміра і на Урале, у гарадах і вёсках чыталі праект Канстытуцыі, уважліва вывучалі яго тэкст. Як чалавек, які прайшоў доўгую і цяжкую дарогу і, падняўшыся на залітую сонцам горную вяршыню, аглядваецца вакол і бачыць новыя зіяючыя гарызонты, так кожны з совецкіх грамадзян бачыў запісаным у праекце Канстытуцыі ўсё, што было заваёвана народам у цяжкай і пераможнай барацьбе народаў СССР.

«Маё жыццё, мая сям'я — гэта Сталінская Канстытуцыя ў дзеянні, — гаварыла іванаўская ткачыха тав. Ганаболева. — Сталінская Канстытуцыя — гэта жыццё мільёнаў такіх-жа рабочых сем'яў, як мая».

Народ назваў Канстытуцыю Сталінскай па імені яе тварца. Усе свае велізарныя перамогі, запісаныя ў Канстытуцыі, рабочыя і сяляне СССР атрымалі пад вадзіцельствам вялікага Сталіна.

У Ленінградзе і ў абласці ў абмеркаванні праекта Канстытуцыі прыняла ўдзел звыш 3 з паловай мільёнаў працоўных, якія ўнеслі больш 20 тысяч паправак, дадаткаў і прапаноў да тэкста Канстытуцыі. У Маскве і Маскоўскай абласці ў абмеркаванні Канстытуцыі ўдзельнічала звыш 5 мільёнаў чалавек. Усюды ствараліся гурткі для вывучэння праекта Канстытуцыі. Абмеркаванне праекта Канстытуцыі ператварылася ў вялікую і пладатворную палітычную школу для ўсяго народа.

Восенню па краіне прайшлі справаздачы дэпутатаў мясцовых Советаў. Народ абмеркаваў работу мясцовых Советаў, крытыкаваў яе з пункту гледжання тых патрабаванняў, якія прад'яўляе да народных выбраннікаў Сталінская Канстытуцыя.

У сувязі з падрыхтоўкай Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў, дзе прадстаяла канчатковае запвярджэнне тэкста Канстытуцыі, у краіне парастаў нябачаны працоўны ўздым. Усё шырэй распаўсюджваўся стаханаўскі рух на фабрыках і палях, усё больш буйных перамог дабіваліся совецкія людзі. Працоўнымі подвігамі народ выражаў адабрэнне новай Канстытуцыі.

КРАІНА СЛУХАЕ ТАВАРЫША СТАЛІНА

25 лістапада 1936 года ў Маскве адкрыўся Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў. У работах з'езда ўдзельнічала 2.016 дэлегатаў ад працоўных СССР. Дэлегатамі з'езда былі 416 рабочых і работніц, 261 селянін і сялянка, партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, ваенныя работнікі, вучоныя, літаратары, інжынеры, служачыя, акторы. У рабоце з'езда ўдзельнічалі 419 жанчын. Дэлегаты з'езда прадстаўлялі 63 нацыі, нацыянальнасці і народнасці, уваходзячыя ў совецкую сям'ю.

У павестцы дня з'езда стаяла толькі адно пытанне: аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР. Дакладчыкам па гэтаму пытанню выступіў таварыш Сталін.

Таварыш Сталін гаварыў аб карэнных змяненнях, адбыўшыхся ў жыцці СССР з 1924 да 1936 года, якія павінны быць адлюстраваны ў новай Канстытуцыі. Ён расказаў аб сусветнагістарычных перамогах соцыялізма ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі краіны — у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, у таваразвароце, — аб тым, што ў Совецкай краіне знішчаны эксплаататарскія класы, знішчана эксплаатацыя чалавека чалавекам і што соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці стала нерушымай асновай грамадства.

Таварыш Сталін паказаў, як змяніліся класы ў СССР, як сціраюцца грані, як скарачаецца адлегласць паміж рабочым класам і сялянствам, паміж гэтымі класамі і інтэлігенцыяй. Ён расказаў аб умацаваўшайся брацкай дружбе народаў СССР, аб тым, што СССР — шматнацыянальная соцыялістычная дзяржава, трываласці якой магла-б пазайздросціць любая нацыянальная дзяржава ў любой частцы свету.

Новая Канстытуцыя, — гаварыў таварыш Сталін, — вынік заваяванняў працоўных.

Таварыш Сталін уважліва і паслядоўна разабраў шматлікія папраўкі і дадаткі, унесеныя грамадзянамі пры абмеркаванні праекта Канстытуцыі, і паказаў, чаму адны папраўкі павінны быць прыняты, а другія — адхілены. Нарэшце, ён расказаў аб тым сусветнагістарычным значэнні, якое мае новая Канстытуцыя, мабілізуючая працоўных СССР на барацьбу для заваёў далейшых перамог комунізма і якая ўказвае працоўным капіталістычных краін шляхі іх вызвалення. Таварыш Сталін ацаніў Канстытуцыю, як «дакумент, які сведчыць аб тым, што тое, што ажыццёўлена ў СССР, упаўне можа быць ажыццёўлена і ў іншых краінах».

Выступленне таварыша Сталіна трансліравалася па радыё. Ля рупараў громкагаварыцеляў, ля ўсіх радыёкропак краіны збіраліся велізарныя масы народа. Людзі зыходзіліся ў залы клубаў, збіраліся ў цэхах, заходзілі ў кватэры, дзе меліся радыёпрыёмнікі, слухалі даклад ля рупараў на вуліцы.

Сталін гаварыў, і простыя, ясныя яго словы слухала затаіўшы дыханне разам з дэлегатамі з'езда ўся краіна. Разам з дэлегатамі з'езда краіна ўсхвалявана апладыравала правадыру, разам з імі яна спявала баявы гімн працоўных — «Інтэрнацыянал».

Сталін гаварыў, і, слухаючы яго, людзі ўспаміналі сваё мінулае, яны па-новаму бачылі цяперашняе, перад іх поглядам падымалася заслона будучыні. Усеагульным лікаваннем быў сустрэт сталінскі даклад.

І калі ўдзельнікі з'езда Советаў пачалі абмяркоўваць даклад таварыша Сталіна, іх вуснамі гаварыў увесь шматмільённы народ СССР.

ДЗЕНЬ 5 СНЕЖНЯ

Дэлегаты гаварылі аб шчасці жыць у сталінскую эпоху, аб узнятым на небывалую вышыню дастоінстве совецкага грамадзяніна, аб гарантыраваным праве на працу, на адпачынак, асвету і соцыяльнае забеспячэнне ў старасці, як найвялікшых правах, заваяваных працоўнымі. Дэлегаты з'езда гаварылі аб тысячах пабудаваных народам фабрык, заводаў, электрастанцый, клубаў, школ, бальніц, аб новапабудаваных гарадах, аб бліскучых поспехах калгаснага ладу, аб дружнай сям'і народаў, аб працоўных подвігах, аб адзінстве совецкага народа, аб яго адданасці справе комунізма, аб яго бязмежнай любві да партыі, да бацькі і настаўніка працоўных таварыша Сталіна.

Некалькі дзён ішло абмеркаванне даклада таварыша Сталіна. Затым з'езд для канчатковага рэдагавання тэкста новай Канстытуцыі выбраў Рэдакцыйную Камісію на чале з таварышам Сталіным. У састаў Камісіі, побач з кіраўнікамі партыі і ўрада, профсаюзнымі і ваеннымі работнікамі, уваходзілі праслаўленыя па ўсю краіну людзі працы, навукі, культуры. У камісію былі выбраны такія вядомыя людзі, як данецкі шахцёр Стаханаў, чыгуначныя машыністы Крыванос, Огнёў, Багданаў, каваль Горкаўскага аўтазавода Бусыгін, калгасная звеннявая Байдзіч, трактарыстка Кавардак, камбайнер Колесаў, шавец Сметанін, сталявар Мазай, настаўніца Асланава, вучоныя Багамолец, Лысенка, Бурдэнка, артысты Масквін, Літвіненка-Вольгемут, Карчагіна-Александроўская.

Член Рэдакцыйнай Камісіі вядомая калгасніца Марыя Дземчэнка расказала, у якой цудоўна дружнай і простай абстаноўцы працавала Камісія, якая рэдагавала дакумент найвялікшага гістарычнага значэння:

«Усхваляваная сваім удзелам у гэтай камісіі, увайшла я 3 снежня ў адзін з невялікіх залаў Крэмлёўскага палаца. Я заняла месца у 1-м радзе супроць стала прэзідыума.. Хутка ў зал увайшоў таварыш Сталін, а за ім таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч і Калінін. Мы іх сустрэлі бурнымі апладысментамі. Усміхнуўся нам таварыш Сталін, прывітаўся і сеў з другімі кіраўнікамі за стол. Артыкул за артыкулам Канстытуцыі пачаў чытаць таварыш Сталін. Прачытае, спыніцца і запытае:

— У каго ёсць прапановы, якія маюцца папраўкі?

Паглядзіць так, што кожнага падбадзёрыць. Адзін стары падняўся у задніх радах і хацеў сваю прапанову ўнесці. Таварыш Сталін гаворыць яму:

— А вы сюды, да стала падыйдзіце, каб усе чулі.

Стары замяшаўся, паспяшыў да прэзідыума. Прэзідыум змяшчаўся на ўзвышэнні. Да яго вяло некалькі ступенек, каля якіх стаяў стол. Стары заспяшыў, ды каля стала на сходках і спатыкнуўся, ледзь не упаў. Таварыш Сталін кінуўся да яго, каб дапамагчы, а потым стол адсунуў, каб зручней было ўзнімацца па ступеньках.

На пасяджэнні таварыш Сталін стварыў такую абстаноўку прастаты, што ўсе мы сябе адчувалі добра. Кожны, хто меў прапанову ці пытанне, без сцяснення выказваў яго. Таварыш Сталін усіх спакойна выслухае, а потым скажа сваю думку, і бачыш, што лепей не прыдумаеш».

Рэдакцыйная Камісія пасля старраннага абмеркавання прыняла 43 папраўкі да праекта Канстытуцыі. Сярод іх (паміма тых, аб якіх гаварыў таварыш Сталін у сваім дакладзе аб праекце Канстытуцыі) былі і вельмі важныя. Напрыклад, у артыкуле 8-м праекта Канстытуцыі гаварылася: «Зямля, займаемая калгасамі, замацоўваецца за імі ў бестэрміновае карыстанне, гэта значыць навечна». Камісія ўнесла папраўку: «у **бясплатнае** і бестэрміновае карыстанне...»

У артыкуле 40-м праекта Канстытуцыі гаварылася: «Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР, публікуюцца за подпісамі старшыні і сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР». Камісія прыняла ўстаўку: «...публікуюцца на **мовах** саюзных рэспублік за подпісамі...» і т. д.

Увесь ход абмеркавання совецкім народам праекта Асноўнага Закона сваёй дзяржавы дазволіў таварышу Сталіну заявіць:

«...У справе выпрацоўкі і канчатковай аддзелкі Канстытуцыі СССР усенароднае абмеркаванне бясспрэчна прынесла велізарную карысць».

5 снежня 1936 года Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў аднагалосна зацвердзіў тэкст новай Канстытуцыі. У азнаменаванне прыняцця новай Канстытуцыі з'езд пастанавіў аб'явіць 5 снежня ўсенародным святам.

Э. Вішнякоў.

Сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты

ЦЁПЛАЯ СУСТРЭЧА

Днямі адбылася сустрэча кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных па 94-й і 95-й выбарчых акругах з сваімі выбаршчыкамі. 300 выбаршчыкаў сабраліся ў педагагічным вучылішчы.

Кандыдат у дэпутаты горсовета Абрам Ісакавіч Гелер расказаў аб сваім горкім і бязрадасным жыцці пры панаванні памешчыкаў і капіталістаў.

— Дзяцінства маё, — гаворыць ён, — было надзвычайна цяжкім. Мне быў толькі адзін год, калі памёр мой бацька. Пачынаючы з малых год, я пайшоў працаваць па найму да фабрыканта Разелінскага. Такімі-ж крывасмокамі былі Райнборт, Сокалаў, Межэрыцкі, Ушакоў і іншыя, у якіх мне прыйшлося працаваць. Для мяне няма большага шчасця, як працаваць па сваю радзіму, на сябе, на сваіх дзяцей. Я буду працаваць яшчэ лепш, буду да канца адданы справе працоўных.

Цяпер тав. Гелер з'яўляецца стаханаўцам - двухстаночнікам 13-га тэкстыльнага камбіната, прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Слова атрымлівае даверны 94-й выбарчай акругі тав. Кесцін. Ён заклікае выбаршчыкаў у дзень выбараў аддаць свае галасы за тав. Гелера.

З выключнай увагай выслухалі выбаршчыкі прамову кандыдата ў дэпутаты гарадскога Совета Сямёна Пятровіча Мілова. Тав. Мілоў падрабязна спыніўся на значэнні Сталінскай Канстытуцыі, на дасягненнях працоўных у краіне Советаў пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, на дасягненнях заходніх абласцей за 14 месяцаў совецкай улады.

Тав. Мілоў выказаў сваю ўдзячнасць за аказанае яму давер'е.

Сход прайшоў з вялікім уздымам. Пасля схода выбаршчыкі глядзелі мастацкую самадзейнасць навучаючыхся педвучылішча і выступленні артыстаў яўрэйскага тэатра мініятур.

А. Есіповіч.

ДАСТОЙНЫ КАНДЫДАТ

Працоўныя Бельска не першы раз сустракаюцца з Марыяй Іванаўнай Дзьячук. У мінулым годзе яны выбралі яе дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Марыя Іванаўна Дзьячук не забывае сваіх выбаршчыкаў.

27 лістапада адбылася яшчэ адна сустрэча дэпутата з сваімі выбаршчыкамі. На гэты раз тав. Дзьячук сустракаецца як кандыдат у дэпутаты абласнога Совета. Прасторны зал Дома соцкультуры перапоўнены. Старшыня Бельскага горсовета тав. Осташэвіч адкрывае сход і прадастаўляе слова тав. Дзьячук. Марыя Іванаўна гаворыць аб прадстаячых выбарах, аб задачах працоўных, аб заканчэнні перабудовы органаў совецкай улады на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

Сустрэча тав. Дзьячук з выбаршчыкамі адбылася ў Орлянскім сельсовеце, з рабочымі ізразцова-плітачнага завода № 13, з працоўнымі мястэчка Орля і з сялянамі многіх вёсак. Выбаршчыкі на сваіх сходах аднадушна заяўляюць, што аддадуць свае галасы за Марыю Іванаўну Дзьячук.

А. Пысін.

Падтрымліваю цесную сувязь з выбаршчыкамі

Сама я з дзяцінства пражывала ў Крулеўшчызне. Там і пазнала горкі лёс служанкі і работніцы. Працоўныя Крулеўшчызны выбралі мяне сваім дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

Хаця па сваёй асноўнай рабоце ў профсаюзе чыгуначнікаў я пастаянна знаходжуся ў Беластоку, аднак стараюся падтрымліваць цесную сувязь з маімі выбаршчыкамі ў Крулеўшчызне. Там мяне ўсе ведаюць і часта звяртаюцца па розных пытаннях. Нядаўна прыйшоў да мяне рабочы Клентак Марцін і скардзіўся, што яму прыходзіцца працаваць больш 8-і гадзін і нават у выхадныя дні. Я неадкладна адправілася да начальніка будаўніцтва і ўказала яму на незаконныя адносіны да рабочага. Зразумела, што незаконныя дзеянні былі адразу-ж ліквідаваны.

Былі і іншыя выпадкі. Вось прыйшоў да мяне беззямельны селянін Русак, з вёскі Бабічы. Ён расказаў, што даўно ўжо марыць аб тым, каб пабудаваць сабе ўласную хату, але не мае добрага ўчастка зямлі. Я параіла Русаку звярнуцца ў сельсовет. Русак атрымаў участак зямлі, цяпер будуе ўласную хату. Нядаўна я атрымала ад яго пісьмо з падзякай.

У работніцы станцыі Крулеўшчызна тав. Радзіонавай пры рабоце разбіўся вочны шкляны пратэз. Яна звярнулася да мяне з просьбай дапамагчы ёй. Я адразу ўзялася за гэтую справу і дабілася таго, што яе пераслалі ў бальніцу ў Гродна, дзе адпаведны пратэз быў падабраны.

Працоўныя Крулеўшчызны ўзнялі пытанне аб арганізацыі для іх дзяцей дзіцячага сада. Але справа сустрэла цяжкасці з-за недахопу адпаведнага памяшкання. Я дабілася памяшкання. Сад быў арганізаваны.

Кожны свабодны час я аддаю для таго, каб наведваць сваіх выбаршчыкаў.

Ю. Юхневіч,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Радасна жыць і працаваць пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі

★ ★ ★

ДЭПУТАТ --- СЛУГА НАРОДА

Як дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, я ўсе сілы і энергію аддаю служэнню народу.

Многія школы горада Беластока, асабліва былыя прыватныя, знаходзіліся ў зусім непрыглядным становішчы. Так, напрыклад, школе № 25 проста пагражаў абвал. Школы № 6, 11, 30 і іншыя доўгі час не рамантаваліся. Мне прышлося перамагчы многа цяжкасцей, каб школы забяспечыць неабходным будаўнічым матэрыялам. Мае старанні ў гэтым напрамку ўвянчаліся поспехам. Пасля рамонту школы сталі непазнавальнымі. Школа № 25 пераведзена ў новы будынак па Совецкай вуліцы. Новы будынак быў пабудаван у рэкордны тэрмін — 6 месяцаў. Зараз у прасторных класах гэтай школы вучацца каля 400 дзяцей.

Многа ўвагі прышлося ўдзяліць пытанню аб тых школьных будынках, якія выкарыстоўваліся не па назначэнню. Згодна пастановы партыі і ўрада, было ўсё зроблена для таго, каб звярнуць школьныя будынкі школам.

Усе свае сілы я аддаю ажыццяўленню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якую праводзяць наша партыя і ўрад у галіне народнай асветы. Я бесперапынна цікавіўся і актыўна ўдзельнічаў ва ўсіх мерапрыемствах, якія накіраваны на тое, каб дзеці займаліся ў школе на іх роднай мове. А калі на гэтым участку былі дапушчаны памылкі, як у Крынках, Бельску і іншых раёнах нашай вобласці, я стараўся прыняць меры, каб іх выправіць.

Часта мяне наведваюць мае выбаршчыкі. Яны ведаюць мяне добра і прыходзяць да мяне дамоў прама з работы, калі ў іх ёсць важная справа, якую трэба неадкладна вырашыць.

Я ніколі не забываю сталінскіх слоў аб тым, што дэпутат павінен быць слугой народа.

А. Машэвіцкі,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

—о—

Служу інтарэсам працоўных

Выбраны дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР працоўнымі Чыгуначнай акругі горада Беластока, я стараюся служыць інтарэсам працоўных.

Рабочыя і сяляне пры ўладзе капіталістаў не адчувалі клопатаў дзяржавы аб сваім здароўі. Ніхто не думаў аб тым, каб стварыць адпаведныя ўмовы для развіцця іх дзяцей. Профсаюз чыгуначнікаў рашыў арганізаваць піонерскі лагер у мястэчку Азёры. Але аказалася, што памяшканне, прадназначанае для лагера, заняў саматужна-прамысловы саюз, які, не гледзячы на частыя звароты профсаюза, не хацеў аддаць памяшканне.

Два месяцы я ўпорна дабіваўся, каб перадаць гэтае памяшканне для нашых дзяцей. Паехаў спецыяльна ў Скідэль, пабываў у раённым выканаўчым камітэце, звярчваўся неаднаразова ў абласны выканаўчы камітэт і, нарэшце, дабіўся: памяшканне было перадана пад піонерскі лагер. 600 дзяцей атрымалі магчымасць правесці лета на свежым паветры. Яны загарэлі, акрэплі і бадзёрымі вярнуліся дамоў.


Часта звяртаюцца да мяне старыя рабочыя, якія дабіваюцца прадастаўлення ім пенсіі. Аднойчы я атрымаў пісьмо ад рабочага Генрыха Невяроўскага, які скардзіўся, што ўсё сваё жыццё ён працаваў, а зараз ніхто яму не хоча дапамагчы. Прышоўшы да яго на кватэру, я пераканаўся, што Невяроўскі ўжо стары, жонка аслепла, дзяцей у іх няма. Я накіраваў яго ў гарадскі аддзел сацыяльнага забеспячэння, дзе яму была выплачана дапамога і назначана пенсія.

Такое-ж пісьмо я атрымаў ад старога чыгуначнага майстра Станкевіча. Калі я прышоў да яго і запытаў: «Вы да мяне пісалі пісьмо?», Станкевіч з здзіўленнем адказаў: «Не, пісьмо я пісаў, але не вам, а дэпутату». Мой адказ, што я з'яўляюся іменна гэтым дэпутатам, паказаўся Станкевічу настолькі незвычайным, што ён адразу не хацеў паверыць, бо ў паслоў панскага сейма не было прынята наведваць сваіх выбаршчыкаў і цікавіцца іх жыццём.

Пасля майго ўмяшання Станкевіч атрымаў пенсію.

Мае выбаршчыкі часта да мяне пішуць. За апошні час я атрымаў больш 30 пісем і заяў. Усе гэтыя заявы я старанна разглядаю і прымаю меры да задавальнення законных патрабаванняў маіх выбаршчыкаў.

П. Вайцэшук,
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.



У час панавання польскіх памешчыкаў і капіталістаў уся сям'я рабочага-паляка Стаселюка была беспрацоўнай.
Зараз усе дарослыя члены сям'і працуюць на 2-ім тэкстыльным камбінаце.
На здымку (злева направа): Стаселюк Чэслаў (ткач), яго жонка Леакадзія (прысучальшчыца), дочкі — Ірэна (ткачыха) і Елена (штопальшчыца). Фота А. Сапіра.

Пачатак жыцця

У першыя дні прыходу часцей Чырвонай Арміі ў маёнтак Ваньковічаў прышоў Антон Нікалаевіч Мазур. У панскім доме яго прыняў палітрук. Яны доўга, задушэўна гутарылі. Тут-жа палітрук аб'явіў Нікалаю, што яму дазваляецца сумесна з сям'ёй пераехаць у былы маёнтак і заняць сабе кватэру.

Праходзіць месяц, другі. У былым маёнтку Ваньковіча арганізаваўся калгас «I мая». У калгас уступіла 29 батрацкіх і бядняцкіх сем'яў. Першымі ў спісках запісаўшыхся сталі прозвішчы Антона Мазура і Івана Крамкова. Началася калектыўная праца. Калгасу аддалі лепшую зямлю, будынкі. Першую большэвіцкую вясну маладыя калгаснікі правялі дружна і арганізавана. Яшчэ больш паспяхова праведзена ўборка ўраджаю.

Мінуў першы сельскагаспадарчы год. З вялікай радасцю расказваюць калгаснікі аб сваёй грамадскай гаспадарцы. Зараз у іх створана тры жывёлагадоўчых фермы: малочная, свінагадоўчая, аўцагадоўчая. Расце пагалоўе калгаснага стада авечак і свіней, пасаджана два гектары новага саду, ідзе падрыхтоўка да развіцця парніковай гаспадаркі.

Дружная і чэсная праца калгаснікаў дала станоўчыя вынікі. Толькі авансам на працадні сям'я калгасніка Мазура атрымала 140 пудоў збожжа і 400 пудоў бульбы. Пры канчатковым разліку яны атрымаюць яшчэ 100 пудоў хлеба і столькі-ж бульбы. Акрамя таго, грашовы прыбытак складзе амаль тысячу рублёў.

Вялікія вынікі калгаснага жыцця падводзяць і ўсе астатнія члены арцелі.

Радасна сустракаюць вызваленыя ад панскага прыгнёту батракі і малазямельныя сяляне вялікае свята— дзень Сталінскай Канстытуцыі, пад сонцам якой пышным цветам расцвітае новае калгаснае жыццё.

В. Гарбанёў.
Калгас «1 мая», Дамброўскага раёна.

Мы карыстаемся дабротамі Сталінскай Канстытуцыі

Тут, у Беластоку, нарадзілася і вырасла наша сям'я. А сям'я ў нас не маленькая — 10 чалавек. У былы час столькі чалавек у сям'і было сапраўдным няшчасцем. Нялёгка пракарміць чалавека, вывесці яго ў жыццё, абучыць пісьменнасці. Усё гэта было не па нашай кішэні.

Жыццё наша было горкае, як палын. Глава нашага сямейства Чэслаў Войцэхавіч Стаселюк на сваёй уласнай спіне адчуў капіталістычны прыгнёт. Усё сваё жыццё ён біўся, як рыба аб лёд, і толькі для таго, каб сям'я магла як-небудзь пражыць, каб яна не памёрла з голаду. Яму было цяжка, але і нам было не лягчэй. Вось, як цяпер, стаіць перад нашымі вачыма маленькая падслепаватая карасінавая лямпа, халодная хата, дзе ўсё выглядала панура. Ад вільгаці мы часта хварэлі. Асабліва цяжка было зімой. Усе дзеці сядзелі дома, бо не было чаго абуць. Дзеці багатых ішлі ў школу, але мы былі пазбаўлены гэтай магчымасці і раслі непісьменнымі.

Цяжкі шлях прайшоў глава нашай сям'і Чэслаў Войцэхавіч Стаселюк. З 14 год ён пачаў вучыцца ткацкай справе. Што гэта была за вучоба, многія старыя ткачы добра памятаюць. Гэта не тое, што цяпер, калі юнакоў кормяць, апранаюць і бясплатна абучаюць рамяслу. Тады набыць кваліфікацыю было справай нялёгкай.

У 1918 годзе Чэслаў паехаў у далёкія землі шукаць шчасця. Стаў шахцёрам у адной з шахт Германіі. Але і тут жыццё было не лепшае. Аднойчы з ім здарыўся няшчасны выпадак. Пры спуску ў шахту ваганетка адсекла яму поўпальца. Так і закончылася там яго шахцёрская дзейнасць, і ён зноў вярнуўся ў свой родны горад, прыняўся за сваю старую прафесію ткача. Прапрацаваўшы нямнога часу, ён зноў стаў беспрацоўным.

Тры годы ён прасядзеў без работы. Беспрацоўная была і наша маці — Леакадзія Вікенцьеўна. Так бязрадасна цяклі нашы дні, тыдні, месяцы, годы.

Новае жыццё прынесла нам совецкая ўлада. Тое, што мы маем цяпер, раней у нас не было і ў думках. Упершыню за 18 год беспрацоўя Леакадзія Вікенцьеўна стала працаваць прысучальшчыцай на 2-м тэкстыльным камбінаце. Тут-жа працуюць яшчэ тры члены нашай сям'і. Елена — штопальшчыцай, Ірэна — ткачыхай і Яніна— мотальшчыцай. Працуем усе так, каб пра сям'ю Стаселюк сказалі: гэта адданыя работнікі. Глава нашай сям'і лічыцца адным з першых стаханаўцаў на 2-м камбінаце. Ён хоча, каб і члены яго сям'і таксама працавалі па-стаханаўску. Кожны з нас стараецца працаваць чэсна, добрасумленна. Стаханаўская работа добра і аплачваецца. Наш сямейны бюджэт складае звыш 1.200 рублёў у месяц. Нядаўна мы атрымалі ад дзяржавы 2 тысячы рублёў па многадзетнасці. Жывём у светлай кватэры.

Да выбараў рыхтуемся ўсёй сям'ёй, актыўна ўдзельнічаючы ў выбарчай кампаніі. Бацька —член участковай выбарчай камісіі, маці — намеснік старшыні акруговай выбарчай камісіі, дачка Елена — член участковай выбарчай камісіі.

Мы карыстаемся дабротамі нашай Сталінскай Канстытуцыі. Будзем-жа працаваць яшчэ лепш, каб умацаваць нашу родную совецкую ўладу, будзем яшчэ больш удзельнічаць у грамадскім жыцці!

У дзень 15 снежня мы ўсёй сям'ёй пойдзем да выбарчых урнаў і аддадзім свае галасы за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, за наша радаснае сучаснае і яшчэ лепшае будучае.

Чэслаў Войцэхавіч Стаселюк, Леакадзія Вікенцьеўна Стаселюк, дочкі: Яніна, Ірэна і Елена.

Забяспечаная старасць

Нарадзіўся я 68 год таму назад, у час царскага прыгнечання, у сям'і батрака. Калі мне споўнілася 15 год, я пайшоў батрачыць.

З 1914 года працую на электрастанцыі качагарам.

У 1932 годзе пачаў думаць пра будучыню, пра тое, што наступіць час, калі аслабнуць рукі і я не ў сілах буду выконваць сваю цяжкую работу. Мяне ўсё мацней ахапляў страх за надыходзячую старасць. І не толькі мяне, але і іншых старых рабочых. Ва ўмовах-жа былой Польшчы рабочы чалавек не меў забяспечанай старасці. У лепшым выпадку ён мог атрымаць падачку. Аб тым, каб адначасова з прызначэннем «пенсіі» захоўваць права на працу, і марыць не прыходзілася ў краіне, дзе за варотамі прадпрыемстваў стаялі тысячы беспрацоўных.

Цяпер мы жывём у свабоднай, шчаслівай краіне соцыялізма.

У Сталінскай Канстытуцыі, чацвертую гадавіну якой мы сёння святкуем, цвёрда сказана, што грамадзяне СССР маюць права на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці.

І вось я зараз атрымліваю ад совецкай улады па 180 рублёў месячнай пенсіі па старасці. Адначасова я працягваю працаваць на Беластоцкай электрастанцыі. І гэта зразумела. У нас, у Совецкім Саюзе, няма беспрацоўя, гэтага жудаснага бічa капіталістычнага ладу.

Акрамя пенсіі па старасці, я зарабляю 500 рублёў у месяц, лічуся ўдарнікам. Да кастрычніцкіх свят я атрымаў прэмію 200 рублёў.

Я імкнуся працаваць як можна лепш, каб выказаць сваю ўдзячнасць совецкаму ўраду, комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну за ўсё тое, што для мяне зроблена.

Буду чэсна працаваць на дабро нашай вялікай радзімы, пакуль хопіць маіх сіл.

Н. Чалпінскі,
старшы качагар Беластоцкай электрастанцыі.

Права выбіраць і быць выбраным

Вызваленыя народы заходніх абласцей БССР перажываюць радасныя дні падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя органы совецкай улады. У сувязі з гэтым мімаволі паўстаюць прыкрыя ўспаміны аб нядаўнім жудасным мінулым.

Былая Польшча — краіна цемры і бяспраўя, дзе панаваў дзікі соцыяльны і нацыянальны прыгнёт працоўных, сваволле, штык і гумавая палка паліцыянта. У Польшчы была таксама і канстытуцыя, і розныя пісаныя законы, было іх многа, але яны служылі эксплаататарам. Кожны паліцыянт, войт, секвестратар і іншы служка памешчыкаў і капіталістаў меў заўсёды права беспакарана змяніць любы закон, калі гэта было на руку пануючым класам.


Гнёт панскага бота моцна адчувала моладзь, і асабліва прагрэсіўная частка яе. Перспектывы моладзі ў былой панскай Польшчы — папаўненне многамільённай арміі беспрацоўных, галоднае і халоднае існаванне, або куток у перапоўненай турме.

Асвета, вучоба была даступна толькі для дзяцей памешчыкаў і капіталістаў. Аб палітычных правах для моладзі не магло быць і гутаркі. Такіх правоў польская канстытуцыя не забяспечвала працоўным. Не дзіўна, што маса моладзі, шукаючы крыніц да існавання, папаўняла рады крымінальных злачынцаў, прастытутак, бяздомных. Многія, будучы не ў сілах перанесці цяжкае жыццё, шукалі выхаду ў самагубствах. Толькі найбольш сільныя, свядомыя знаходзілі свой шлях у рэвалюцыйнай барацьбе. За гэта іх чакала смерць ад рукі катаў або доўгагадовае гніццё за кратамі.

Так было.. Мы гэта перанеслі на ўласных плячах.

Зараз моладзь, дзеці рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, з'яўляюцца поўнакроўнымі будаўнікамі комуністычнага грамадства. Мы адчуваем сябе роўнапраўнымі грамадзянамі вялікай краіны соцыялізма. Сталінская Канстытуцыя забяспечыла нам права на працу, вучобу, адпачынак, дала нам палітычныя правы. Нідзе ў свеце моладзь не мае такіх шырокіх правоў, як у Совецкім Саюзе.

У нашым педагагічным інстытуце—першай вышэйшай навучальнай установе на землях былой Заходняй Беларусі — вучыцца тая моладзь, якая раней магла толькі марыць аб вучобе. Беларусы, рускія, яўрэі, палякі — разам за адным сталом здабываюць асвету. Назаўсёды канула ў нябыт нацыянальная нянавісць. Такія таварышы, як Лашэвіч, Коп, Літвін, Налівайка і інш., праследуемыя раней, сёння маюць магчымасць вучыцца, яны з'яўляюцца совецкімі студэнтамі.



Маладыя выбаршчыкі — студэнты Беластоцкага педінстытута віншуюць свайго кандыдата ў дэпутаты горсовета Олю Налівайка (другая злева). Фота А. Сапіра.

Мы, шчаслівая совецкая моладзь, маем права выбіраць і быць выбранымі ў органы совецкай улады. Калектыў нашага інстытута вылучыў кандыдатамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных 4-х чалавек. Сярод іх наша студэнтка Ольга Налівайка — кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета. Дачка беднага селяніна, бяспраўная раней, яна ўдастоена вялікай чэсці быць прадстаўніком совецкага студэнцтва ў гарадскім Совеце. Такіх выпадкаў не было і не магло быць у панскай Польшчы.

Мы ведаем, што вялікія правы совецкай моладзі забяспечыла Сталінская Канстытуцыя — адзіная ў свеце, да канца дэмакратычная Канстытуцыя. Яна заклікала да актыўнага палітычнага жыцця мільёны працоўнай моладзі. Сёння мы самі трымаем свой лёс у сваіх руках, з'яўляемся гаспадарамі свайго жыцця. Перад моладдзю нашай неабсяжнай краіны адкрыты ўсе дарогі да радаснай, шчаслівай будучыні. Мы не баімся ніякіх цяжкасцей, ляжачых на нашым шляху да мэты. Мы ўпэўнены, што нашу мэту— пабудову комунізма—мы дасягнем. Мы будзем вучыцца і працаваць так, каб апраўдаць словы нашага геніяльнага настаўніка таварыша Сталіна, які сказаў: «Моладзь — гэта наша будучыня, наша надзея».

В. Бахар, А. Аб'езчыкаў, І. Францкевіч, М. Петрыкевіч,
студэнты Беластоцкага педагагічнага інстытута.

★ ★ ★

СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ І АХОВА ЗДАРОЎЯ ПРАЦОЎНЫХ

Беластоцкія тэкстыльшчыкі ўпершыню выкарысталі ў гэтым годзе права на адпачынак, запісанае ў Сталінскай Канстытуцыі.

На працягу мая—жніўня месяцаў сотні ткачоў, прадзільшчыц, мотальшчыц, сукнавалаў, фарбавальшчыкаў і іншых рабочых тэкстыльнай вытворчасці правялі свой водпуск у добра абсталяваных дамах адпачынку. З пачуццём глыбокай удзячнасці за сталінскія клопаты аб працоўных ехалі беластоцкія тэкстыльшчыкі ў Ждановічы, Ніўкі, Барысаў весела і культурна праводзіць свой адпачынак.

Лепшыя стаханаўцы, ударнікі, старыя кадравыя рабочыя ўсхвалявана перадавалі свае ўражанні аб прабыванні ў дамах адпачынку. Больш 150 тысяч рублёў было выдаткавана ў гэтым годзе на пуцёўкі для тэкстыльшчыкаў Беластока.

130 тысяч рублёў ужо выдаткавана на пуцёўкі для санаторнага лячэння. Курорт Друскенікі, які да гэтага часу маглі наведваць толькі багацеі, наведалі ў гэтым годзе 98 рабочых і служачых тэкстыльных фабрык і заводаў.

Цяжкая спадчына капіталістычнага ладу — туберкулёз — паразіла не мала тэкстыльшчыкаў, аддаўшых сваё здароўе капіталістычнай фабрыцы, дзе не было праяўлена ніякіх клопатаў аб паляпшэнні ўмоў працы. У гэтым годзе 57 хворых туберкулёзам лёгкіх былі накіраваны для лячэння ў туберкулёзныя здраўніцы— Крым, Сасноўку, Варохту і іншыя. 22 чалавекі з іх знаходзіліся ў санаторыі па два месяцы. Цяпер у сталовых фабрык арганізаваны сталы дадатковага харчавання, дзе хворыя атрымліваюць за кошт сродкаў соцыяльнага страхавання дадатковыя харчы.

Беластоцкія тэкстыльшчыкі наведалі ў гэтым годзе Сочы, Ярэмчу, Моршын, Трускавец і іншыя курорты.

Клопаты былі праяўлены і аб дзецях рабочых. Звыш 500 дзяцей тэкстыльшчыкаў Беластока адпачывалі ў піонерскіх лагерах, 111 дзяцей былі накіраваны ў дзіцячыя санаторыі ў Крым, Друскенікі, Пышкі і іншыя.

Так пераканаўча адчулі беластоцкія тэкстыльшчыкі права на адпачынак, запісанае ў Сталінскай Канстытуцыі, клопаты аб здароўі рабочых і іх дзяцей.

А. Прыцкер,
старшыня абкома саюза шарсцянікаў.

—о—

Адбыліся вялікія змяненні

У беластоцкай бальніцы № 3 да прыходу Чырвонай Арміі я працаваў 7 год. Як яўрэй, я не атрымліваў нават зарплаты. Трэба было ўсяляк угаджаць панам, каб пракарміць сям'ю. Не было ніякага жадання змагацца за добрую пастаноўку бальнічнай справы, бо многія з нас — урачоў ведалі, што нашы намаганні пры панаванні капіталістаў не прыносілі карысці працоўным. 90 процантаў кліентаў бальніцы былі багацеі, буржуазія. Рабочыя і працоўныя сяляне не маглі карыстацца паслугамі бальніцы — лячэнне было платнае.

Усяму гэтаму назаўсёды пакладзен канец у верасні 1939 года. Чырвоная Армія вызваліла працоўных заходніх абласцей Беларусі і дала ім магчымасць уліцца ў дружную сям'ю народаў вялікага Совецкага Саюза, стаць пад яркія сцягі Сталінскай Канстытуцыі. З тых пор прайшло больш года. Якія вялікія змяненні адбыліся ў нашым жыцці! У дзень Сталінскай Канстытуцыі мне яшчэ раз хочацца сказаць аб іх. А для гэтага мне не трэба куды-небудзь ісці за прыкладамі. Адбыўшыяся змяненні самі кідаюцца ў вочы на кожным кроку. Скажам аб нашай бальніцы. Раней у нас мелася 25 ложкаў, зараз іх — 130. Павелічэнне больш, чым у 5 разоў! Раней не было ў нас рэнтгенаўскага кабінета, зараз ён ёсць. Атрымалі выдатнае лабараторнае абсталяванне. І самае галоўнае — у нас, як і ва ўсіх совецкіх бальніцах, працоўныя карыстаюцца бясплатным лячэннем.

У нашай бальніцы зараз працуе не 3, а 12 урачоў. Усе добра матэрыяльна забяспечаны.

Нашы поспехі дасягнуты пад кіраўніцтвам нашай комуністычнай партыі, дасягнуты дзякуючы таму, што мы жывём і працуем пад светлым сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Н. Клеменціноўскі,
галоўны ўрач Беластоцкай бальніцы № 3.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ПАВЕДАМЛЕННЕ АФІНСКАГА РАДЫЁ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ

АФІНЫ, 4 снежня. (ТАСС). Афінскае радыё аб'явіла ўчора, што грэчаскія войскі знаходзяцца ў цяперашні час у двух кілометрах ад Сантыкваранта і што горад Прэмет заняты грэчаскімі войскамі. Грэчаскія войскі занялі новыя пазіцыі ў раёне Аргірокастрона.

Паведамленне замежных карэспандэнтаў аб эвакуацыі італьянцамі Аргірокастрона да вечара не было пацверджана.

—о—

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 4 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра наступнае камюніке англійскага камандавання паветраных сіл, апублікаванае ўвечары 3 снежня: «Ноччу 2 снежня нашы бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Неапаль, падвергнуўшы бамбардыроўцы чыгуначны вузел і нафтаачышчальныя заводы. Прамыя пападанні бомб выклікалі моцныя пажары на нафтаачышчальным заводзе. Паблізу ракі Міс англійскія самалёты бамбардзіравалі чыгуначную станцыю, выклікаўшы ўзрывы і пажары.

Акрамя таго, англійскія самалёты бамбардыравалі аэрадром у Катанія (Сіцылія), дзе былі скінуты запальваючыя бомбы. Адзін самалёт праціўніка, знаходзіўшыйся на аэрадроме, згарэў. У Аўгуста, якая таксама падвергласа бамбардыроўцы, скінутыя бомбы выклікалі рад узрываў, у рэзультаце якіх узнік моцны пажар. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы».

—о—

КАМПАНІЯ ГРАМАДЗЯНСКАГА НЕПАВІНАВЕННЯ У ІНДЫІ

КАБУЛ, 4 снежня. (ТАСС). Газета «Бомбей хронікл» у нумары ад 21 лістапада паведамляе, што Гандзі ўжо выдзеліў 1.200 чалавек членаў індыйскага нацыянальнага кангрэса для ўдзелу ў кампаніі грамадзянскага непавінавення. К канцу снежня ён намерваецца давесці лік сат'яграхістаў да 5 тысяч. Мясцовыя арганізацыі індыйскага нацыянальнага кангрэса складаюць спіскі актыўных членаў для прыцягнення іх да ўдзелу ў кампаніі. У цэнтральных правінцыях у гэтыя спіскі ўключана 500 чалавек, у Патне—150, у Калькуце — 100 і т. д. У гэтыя спіскі ўключаюцца таксама імёны членаў сацыялістычнай партыі, якая прымыкае да кангрэса.

Паводле паведамлення газеты «Сівіл энд мілітэры газет» ад 28 лістапада Гандзі рэкамендуе сат'яграхістам не арганізоўваць спецыяльных мітынгаў з антываеннымі прамовамі, а выкрыкваць антываенныя лозунгі ў мнагалюдных месцах.

У той-жа газеце ад 23 лістапада ўказваецца, што відны дзеяч кангрэса, лідэр апазіцыі ў Заканадаўчым сходзе Булабхаі Дэсаі пасля 4-гадзіннай гутаркі з Гандзі выступіў на мітынгу ў Вардзе з прамовай, у якой ён заявіў, што рух сат'яграхістаў будзе працягвацца да таго часу, «пакуль не будзе дасягнута незалежнасць Індыі». Дэсаі заклікаў сабраўшыхся быць гатовымі на ахвяры. Дакранаючыся ахвілення у заканадаўчым сходзе фінансавага праекта, Дэсаі ўказаў на гэты факт, як на доказ таго, што Індыя супраціўляецца вайне.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 4 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: Адной германскай падводнай лодкай патоплены 6 гандлёвых узброеных суднаў праціўніка агульным танажам у 31.500 рэгістравых бруттатон. Авіяцыя прадпрыняла ўчора налёты на аэрадромы, воінскія лагеры, чыгуначныя збудаванні і ваенныя заводы Англіі. На аэрадроме ў Шорхэм бомбы папалі ў ангары, а таксама разбурылі некалькі знаходзячыхся на зямлі самалётаў.

У ноч на 4 снежня, не гледзячы на дрэнное надвор'е, германская авіяцыя бамбардыравала розныя аб'екты ваеннага значэння ў Цэнтральнай і Паўднёвай Англіі. У гэту-ж ноч асобныя англійскія самалёты скінулі бомбы ў Заходняй і Паўднёва-Заходняй Германіі, але прычынілі толькі невялікі ўрон будынкам.

Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро, у лістападзе германская авіяцыя побач з шматлікімі разрознепымі атакамі прадпрыняла 23 буйных налёты, у час якіх у адну ноч на кожную цэль скідвалася ад 100.000 да 600.000 кілаграмаў бомб. Усяго ў час гэтых буйных атак было скінута 5 мільёнаў запальваючых бомб.

На працягу ўчарашняй ночы бамбардыроўцы нападалі Лондан, Саутгемтон і, асабліва, Бірмінгам. У Бірмінгаме адзначана звыш 30 моцных пажараў.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 4 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора ўдзень германская авіяцыя зрабіла некалькі невялікіх налётаў на Усходнюю Англію і раён Лондана. Урон і лік ахвяр нязначны.

Увечары бамбардыроўцы напалі два пункты ў Заходняй Англіі.

У ноч на 4 снежня бомбы былі скінуты на Лондан і некаторыя раёны Цэнтральнай Англіі. Агульны лік ахвяр нязначны. Узнікшыя ў раёне раёнаў пажары былі хутка ліквідаваны. У Лондане не пацярпеў ні адзін важны аб'ект.

Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, англійская авіяцыя бамбардавала ў ноч на 4 снежня чыгуначныя камунікацыі ў Рэйнскай вобласці.

САУТГЕМПТОН ПЕРАТВОРАН У РУІНЫ

ЛОНДАН, 3 снежня. (ТАСС). Як перадае спецыяльны карэспандэнт агенцтва Рэйтэр з Саутгемптона, пасля жорсткай бамбардыроўкі, прадпрынятай германскай авіяцыяй у ноч на 2 снежня, горад ператварыўся ў руіны, і тысячы людзей засталіся без прытулку. Сотні рабочых, з'явіўшыся на месца службы, знайшлі замест прадпрыемстваў адны руіны. Некаторыя вуліцы зусім непраходзімы. Сотні салдат разбураюць пагражаючыя абвалам будынкі ў цэнтры горада.

Запытанні ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 4 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у палаце абшчын было задана пытанне, ці можа ўрад даць запэўненне, што ён не заключыць якога-небудзь саюза з ЗША і не прадпрыме ніякіх шагоў у гэтым напрамку без папярэдняга абмеркавання гэтага пытання ў парламенце. Этлі адказаў, што яму невядома аб якіх-небудзь прапановах гэтага роду, але ён зусім упэўнен, што калі-б падобны план знаходзіўся ў галіне практычнага вырашэння, то гэта было-б магчыма толькі пасля абмеркавання гэтага пытання парламентамі абодвух краін.

Выступаючы ў спрэчках, міністр унутраных спраў і ўнутранай бяспекі Морысон адмаўляў «усякія абвінавачванні ва ўмысным і жорсткім праследванні інтэрніраваных іншакраінцаў» Морысон паведаміў, што вызвалена каля 8 тысяч інтэрніраваных. Асталося 19.600. Адносна высылкі групы інтэрніраваных у Канаду Морысон сказаў, што каля паловы з іх былі высланы неправільна.

Заява англійскага міністра па справах дамініёнаў

ЛОНДАН, 4 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійскі ўрад адмовіўся ад існуючай да гэтага часу практыкі рассылкі важных рашэнняў кабінета ўсім без выключэння дамініёнам.

Выступаючы ў палаце абшчын міністр па справах дамініёнаў заявіў, што ўперад такога роду рашэнні кабінета не будуць пасылацца ў Эйрэ.

Гэтыя запэўніванні былі зроблены ў сувязі з меўшымі месца пытаннямі ў палаце абшчын, у якіх указвалася, што «германская і італьянская місіі ў Дубліне (сталіца Эйрэ) знаходзяцца ў пастаянным кантакце з Берлінам і Рымам».

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

НЬЮ-ЙОРК, 4 снежня. (ТАСС). Як перадае амерыканскі друк, італьянцы працягваюць адступаць да Эльбасана. Грэкі пасля доўгай і жорсткай барацьбы занялі Мумуліста на поўнач ад Паградэца. На паўночным захадзе ад Москаполе яны адбілі контратаку італьянцаў.

Моцная снежная бура, лютаваўшая ў паўднёвым сектары фронта, дае грэкі б'юцца з італьянскімі альпійскімі часцямі, затрудняе дзеянні абодвух бакоў.

РЫМ, 4 снежня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: На грэчаскім фронце атакі мнагалікіх непрыяцельскіх злучэнняў былі затрыманы ўпорным супраціўленнем нашых войск, якія зрабілі пачныя контратакі. Італьянская авіяцыя бамбардыравала зону на захад ад Эрсеке, а таксама порты Прэвезу і Лефкас. У паветраным баі над Тыранай збіта 6 непрыяцельскіх самалётаў. Тры нашых самалёты не вярнуліся на базу. Непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы на Эльбасан. Ахвяры нязначныя, разбурэнняў няма. Нашы самалёты-тарпеданосцы скінулі тарпеды на два непрыяцельскіх крэйсеры. 1 снежня наша падводная лодка тарпедыравала ў Атлантычным акіяне грэчаскі эсмінец.



У піянерскай комнаце польскай школы № 1 (Беласток). Фота Сапіра.

Разняволеная жанчына

У канстытуцыі панскай Польшчы было запісана, што жанчыны карыстаюцца аднолькавымі правамі з мужчынамі. У сапраўднасці-ж гэта была фікцыя і ашуканства. Жыццё паказвала адваротнае. Жанчына ў капіталістычным грамадстве тройчы прыгняталася і ніякай гутаркі аб роўнаправі быць не магло. У органы ўлады жанчыны траплялі адзінкамі і то з асяроддзя багатых. На фабрыках і заводах жаночая праца, як правіла, аплачвалася вельмі нізка. Існавала рад работ, якія лічыліся «справай мужчын».

І на нашай фабрыцы кофе былі такія разрады. К прыкладу, жараўшчык. У мінулым гэта лічылася толькі работай мужчын. Зараз на гэтай рабоце ў нас працуе жанчына тав. Кадзевіч. Яна добра аўладала сваёй работай і з'яўляецца лепшай стаханаўкай. А на лесараспрацоўках? Былая Польшча не ведае такіх жанчын, як жанчына лесаруб, машыніст. Цяпер толькі ў нашым раёне на лесаўчастку Крынічнай працуюць 2 брыгады жанчын-лесарубаў. Брыгада т. Вайтукевіч арганізавалася толькі поўмесяца таму назад, але выконвае план вырубкі лесу на 180—200 працэнтаў.

Жанчына пры капіталізме эканамічна пастаўлена ў такія ўмовы, што не можа прымаць удзел у грамадскім жыцці. Задачы развязвлення жанчыны ва ўмовах капіталізма вырашыць нельга. Гэтая задача разрашыма толькі з ліквідацыяй капіталізма, эксплаатацыі чалавека чалавекам. Адзіная краіна, дзе сапраўды жанчына з'яўляецца роўнаправным грамадзянінам — гэта СССР.

Яркім пацвярджэннем таго, што жанчына ў нашай краіне актыўна ўдзельнічае ў кіраванні дзяржавай, з'яўляецца наша фабрыка і наш выбарчы ўчастак з акругай, па якой я дала згоду балатыравацца ў дэпутаты гарадскога Савета. 40 працэнтаў усіх рабочых нашай фабрыкі — гэта жанчыны. Пераважная большасць работніц з'яўляецца стаханаўкамі і паказваюць прыклад у рабоце.

Дырэктар фабрыкі Ганчарык Бейля Абрамаўна таксама жанчына. Яна добра арганізавала работу фабрыкі. 28 лістапада фабрыка выканала гадавую праграму. Тав Ганчарык карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод рабочых, і яны вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета.

У той час, калі ў былой гродненскай гарадской радзе налічвалася 4 жанчыны, то у нас толькі на 7-м участку горада з 5 кандыдатаў у гарсавет 4 жанчыны. Вось нашы кандыдаткі: Карпенюк Ольга Ігнацьеўна—старшыня заўкома фанернага завода № 8, работніца- стаханаўка; тав. Атрахімовіч—студэнтка настаўніцкага інстытута; тав. Левіна — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі гаркома партыі і г. д. Актыўны ўдзел жанчыны ў грамадска-палітычным жыцці краіны забяспечваецца тым, што жанчыне прадастаўлены роўныя правы з мужчынамі на працу і яе аплату, адпачынак, асвету, сацыяльнае забеспячэнне. Усе гэтыя правы гарантуе Сталінская Канстытуцыя.

Р. Трацяк,
работніца-стаханаўка Гродненскай фабрыкі кофе, кандыдат у дэпутаты гарсовета.

Багаты працадзень

Калгас імені Варашылава, Русінаўскага сельсовета, Скідзельскага раёна, добра справіўся з усімі сельскагаспадарчымі работамі. Калгаснікі ў першы год свайго калектыўнага жыцця дабіліся высокага ўраджаю. Ураджай жыта склаў 17 цэнтнераў з гектара, яравой пшаніцы звыш 13 цэнтнераў з гектара, бульбы 170 цэнтнераў.

На папярэдніх падліках калгаснікі атрымаюць на кожны працадзень па 7 кілограмаў зерн авых, па 16 кілограмаў бульбы і па 5 кілограмаў кармоў.

Міхаіл Кая з сваёй жонкай Марыяй выпрацавалі да 1 лістапада 355 працадзён. Пры выдачы авансам Кая атрымаў на свае працадні 1.065 кілограмаў адных толькі зерневых. Калі яму прывезлі зярно, ён з радасцю заявіў:

— Куды-ж я буду дзяваць хлеб? Я ніколі ў жыцці не меў столькі хлеба.

— Гэта яшчэ не ўсё. Вам яшчэ належыць атрымаць, — сказаў старшыня калгаса тав. Шывілько.

Сям'я калгасніка Пятра Мілашэвіча выпрацавала 800 працадзён, і авансам атрымала 56 цэнтнераў зярна і 128 цэнтнераў бульбы.

— Цяпер хлеба мне хопіць больш, чым на два годы, — гаворыць Пётр Мілашэвіч.

Н. Курыльчык.

Бібліяграфія

АКТУАЛЬНАЯ БРАШУРА

У кніжных магазінах Беластока прадаецца брашура Т. Гарбунова «Вызваленая Заходняя Беларусь».

Гэта невялікая, але змястоўная брашура, напісаная прыгожай мовай, можа даць нашым агітатарам багаты матэрыял для гутарак.

Першая частка брашуры дае нам кароткі нарыс гісторыі Заходняй Беларусі да 1920 года. Аўтар дае нам малюнак векавой барацьбы беларускага народа, які ніколі не мірыўся з сацыяльным і нацыянальным прыгнечаннем. Гэтая барацьба вялася рука аб руку з украінцамі, пры падтрыманні з боку рускага народа.

Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя—гэта пераломная дата ў гісторыі беларускага народа. Ён атрымлівае сваю дзяржаўнасць. Але далейшы ход барацьбы савецкай краіны з імперыялістычным інтэрвентамі дзеліць жывое цела беларускага народа на дзве часткі. Заходняя Беларусь застаецца пад уладай буржуазнай польскай дзяржавы. 20 год прыгнечання і эксплаатацыі былі перыядам, дастатковым для ператварэння краіны ў адсталую калонію польскага і замежнага капітала. Прамысловасць была знарок зруйнавана, вёска вярнулася да прымітыўных сродкаў вытворчасці. Аўтар зусім правільна карыстаецца цытатамі з польскіх буржуазных выданняў, якія нельга назваць падазраваць у сімпатыі да беларускага народа. Ад часу да часу там паяўляліся жудасныя карэспандэнцыі з заходне-беларускай краіны, якая называлася зямлёй, «забытай богам і людзьмі». Калі ў гарадах паяўляўся селянін з «крэсаў», ён рабіў уражанне пострці з малюнка далёкіх вякоў. Польскае турысцкае агенства заахвочвала багатых дармаедаў усёй Еўропы да наведвання Палесся, «гэтага кутка прыгожай першабытнасці», бо дзе яшчэ ў Еўропе можна было знайсці селяніна, які карыстаецца каменнай сякерай, лучынай і драўлянымі сельскагаспадарчымі прыладамі?

Гарбуноў прыводзіць лічбы і факты, жудасныя па сваёй красамоўнасці.

Гістарычная несправядлівасць была ліквідавана нашай геройчнай Чырвонай Арміяй. Не пазнаць цяпер Заходняй Беларусі, так змянілася яе аблічча. Землі і фабрыкі перайшлі да працоўнага народа. Няма ніводнай галіны гаспадарчага і грамадскага жыцця, якая-б не была ўцягнута ў паход сацыялістычнага развіцця. Водныя шляхі, дарогі, фабрыкі, трактары, сацыялістычныя вытворчасць, лячэбныя ўстановы, тэатры, кнігі, газеты—усюды ўзрост, усюды барацьба за далейшае ўзмацненне тэмпаў развіцця, за дасягненне ўзроўню нашых перадавых рэспублік.

Агітаваць трэба фактамі. Збор гэтых фактаў часта патрабуе вялікай працы. Брашура Гарбунова значна аблягчае яе.

А. Оскола.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-82.

УБ — 118. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.